# РЭАБІЛІТАЦЫЯ, МАЁМАСЦЬ, ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



Наталля Качанава заўважыла, што спецыялісты высветляць, дзе, згодна з медыцынскімі паказаннямі сына жанчыны, яму можна прапанаваць найлепшую рэабілітацыю, і дадала, што ў Аксакаўшчыне праводзяць рэабілітацыю на ўсіх стадыях:

— Мы сур'ёзна займаемся аховай здароўя, у тым ліку і рэабілітацыяй, праходзіць поўны маніторынг сістэмы аховы здароўя. На дадзеным этапе я б вам парэкамендавала пагадзіцца на рэабілітацыю ў Аксакаўшчыне, а мы паглядзім і пракантралюем, што яму прызначаць: працэдуры, прэпараты. Калі такім людзям патрэбна рэабілітацыя, то варта вызначыць і патрэбную перыядычнасць у ёй.

## Захоп уласнасці і дзелавая рэпутацыя

Са скаргай на незаконны захоп ва ўласнасць шляхам падробкі подпісаў прадпрыемства «Агрэст» прыйшла да сенатара пенсіянерка Галіна. Такіх былых уладальнікаў маёмасці, якую яны прыватызавалі ў 1995-м і ўкладвалі свае грошы ў яе пакупку, восем чалавек, усе на пенсіі. Пасля да іх у давер увайшлі два чалавекі, якія сталі сузаснавальнікамі. Потым новыя саўладальнікі сталі здаваць будынак у арэнду.

— За ўвесь час мы не атрымалі ні капейкі (а яны атрымалі за пяць гадоў 300 тысяч еўра), не праводзіцца сходы, яны не адказваюць на нашы лісты. З 2010 года мы звярталіся ў пракуратуру, міліцыю, нам усе раяць ісці ў суд, — расказала Галіна. — Летась мы даслалі ліст у генпракуратуру, а яна пераслала яго ў гарадскую, пасля ў раённую (Партызанскага раёна. — **Рэд.**), адкуль адказалі, што наш зварот ананімны і разгляду не падлягае.

Наталля Качанава даручыла Надзеі Лазарэвіч, першаму намесніку старшыні Мінгарвыканкама, каб яна разам з Мінюстам разабралася, што гэта за ўласнік будынка, тым больш што ён там не адзін уласнік:

— Хай яна сустрэнецца з ім асабіста, разбярэцца, чаму так да людзей ставяцца, што яны вымушаны судзіцца, што ён у будынку робіць. Ну няхай бы выкупіў долю і займаўся сабе далей. Ён павінен выплаціць грошы па сваіх абавязацельствах. Трэба ўвогуле паглядзець на кожны будынак Мінска. Хто ўладальнік, што там робіць, каб не было вось так. І яшчэ трэба думаць, каму здаваць будынкі ў арэнду, каб гэта не перашкаджала суседзям у жылых дамах.

Наступны заяўнік, які ў адной асобе прадстаўляе і індывідуальнага прадпрымальніка, і ўласніка гандлёвага прадпрыемства, скардзіцца на налічаныя яму 500 тысяч падаткаў. Генадзь са Жлобіна як індывідуальны прадпрымальнік набыў будынак, дзе зрабіў рамонт, а ў 2005-м стварыў гандлёвае прадпрыемства, якому ён здаваў гэты будынак, зарэгістраваны на ІП (на яго. — **Рэд.**). Прадпрыемства з часам пашыралася і ў 2018-м набыло з аўкцыёну яшчэ адзін будынак, які зарэгістравалі на прадпрыемства, за кошт якога зрабілі і рамонт. Цяпер на прадпрыемстве працуе 280 чалавек, дзе вырабляюць і прадаюць хлебабулачныя вырабы (каля 30 тон) і кулінарыю (55 тон).

— Я здаваў памяшканне ў арэнду прадпрыемству (свайму ж) пяць гадоў бязвыплатна. Калі справы ў прадпрыемства пайшлі, пачаў браць арэндную плату (удвая ніжэйшую за рыначную). У 2020 годзе інспекцыя па падатках і зборах запатрабавала дакументы аб узаемадзеянні ІП з прадпрыемствам. Праз два-тры тыдні я пазваніў, мне сказалі, што ўсё нармальна. Даведку не далі, бо ўсё ў парадку было. Летась Дэпартамент фінансавых расследаванняў мяне зноў папрасіў прадставіць дакументы аб узаемаразліках, і там сказалі, што не было ў мяне ніякай праверкі ў 2020-м. Мне налічылі 500 тысяч падаткаў за тое, што ІП (я) здаваў памяшканне ў арэнду ўзаемазалежнай асобе (прадпрыемству) без аплаты. Я апляцыю гэтыя грошы, бо сказалі, што замарозяць рахункі, а мне дзелавая рэпутацыя даражэйшая, аднак я напісаў, што з гэтым не згодны. Я неаднаразова прасіў патлумачыць, як нам працаваць далей, каб было правільна, і што рабіць. Дайшла справа і да суда, і падатковая цяпер прызнае, што ў 2020-м яны рабілі камеральную праверку.

Прадпрымальніку ставяць у віну, што і ІП, і прадпрыемства зарэгістраваны па адным адрасе (хатнім Генадзя), што ён недастаткова добра развіваў уласнае прадпрыемства, знізіўшы арэндную стаўку, здымаў 70 % здабытку, які ён забіраў як ІП, а яму кажуць, што гэта абнаўлянне сродкаў. Усе абвінавачванні разглядаюцца ў комплексе, хаця прамых забарон законам і парушэнняў яго няма.

— Вы наўмысна зрабілі так, каб у прадпрыемства была павялічана затратная частка і яно магло плаціць менш падаткаў на прыбытак і падаходных падаткаў. З 2010 года прадпрыемства не выплачвае дывідэнды. Навошта плаціць, калі можна знізіць арэндную плату і тут жа зняць грошы на ўласнае карыстанне. Аднак калі б гэта было нейкай іншай кампаніі, а не самому сабе... Мы адштурхоўваемся ад тых фактаў, якія былі выяўлены ў ходзе праверкі. Даваць іншую кваліфікацыю вынікам праверкі я не маю права, — патлумачыў **Уладзімір МУКВІЧ, намеснік міністра па падатках і зборах.**

Такое адчуванне, што хтосьці тут недагаворвае, заўважыла спікер Савета Рэспублікі і даручыла разабрацца ў пытанні Камітэту дзяржкантролю, бо тут шмат незразумелага:

— Прадпрыемства сябе зарэкамендавала, і чалавеку трэба разумець, што рабіць. ІП закрываць, ці што? Трэба патлумачыць, што забаронена законам, а што не. Ён правільна пытае, што ён парушыў, што супрацьзаконна. За нешта ж завялі на чалавека крымінальную справу. Мы зараз разглядаем змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці, дык давайце прапішам, што нельга быць у адной асобе і ІП, і прыватным прадпрыемствам. Каб не было такіх сітуацый, што чалавек, здаецца, усё робіць па законе, а праблемы ёсць. Трэба ўнесці ў заканадаўства змены і абазначыць, што нельга рабіць, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Падатковыя органы, магчыма, павінны збіраць ІП і прыватныя прадпрыемствы і тлумачыць, як і што яны павінны рабіць, заўважыла яна.

## Жыллё для дзядулі і аб'яднанне сям'і

На прыём да Наталлі Качанавай прыйшлі Ігнацій і Ганна з просьбай дапамагчы маладой сям'і аб'яднацца. Жонка працуе ўрачом у Вілейцы, а муж — у дарожна-будаўнічым упраўленні ў Віцебску, і ім прыходзіцца жыць паасобку, таму сужэнцы хочуць, каб жонку пераразмеркавалі да мужа ў Віцебск.

— Я вам нічога не магу паабяцаць, тым больш што ў вас было мэтавае накіраванне, і гэта няправільна. Трэба падумаць, як зрабіць, каб і Вілейка не пацярпела, бо нам патрэбны там урачы-неўролагі, аднак і ў Віцебску яны патрэбны. Калі мы зможам знайсці нейкую адэкватную замену, магчыма, нехта захоча пераехаць працаваць у Мінскую вобласць, то можна будзе вырашыць праблему, адным словам, паспрабуем, — паабяцала Наталля Качанава.

Парламентарый дадала, што яна «за тое, каб у Віцебскай вобласці асядалі людзі, і трэба рабіць усё, каб там людзі заставаліся. На Міншчыне ў нас парадак».

Прыйшоў скардзіцца на адсутнасць жылля і 65-гадовы мужчына, які сцвярджае, што 30 гадоў абіваe парогі ўстаноў, каб атрымаць сваё жыллё.

— 10 ліпеня 2020-га мужчына зарэгістраваны па дагаворы найму ў доме ў Смалявічах. 4 верасня 2020-га ён прыняты на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Смалявіцкім райвыканкаме. Быў тады 1600-м у спісе. У асобным спісе на права атрымання сацыяльнага жылля мужчына быў 200-м (цяпер ён у гэтым спісе 164-ы). І яшчэ ён як інвалід ІІ непрацоўнай групы ўнесены (па асобнай падгрупе) за нумарам 6. Аднак адпаведна з артыкулам 98 Жыллёвага кодэксу ён не мае перавагі знаходзіцца ў чарзе, як і астатнія, — пракаментаваў скаргу **Віктар РАГУСКІ, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама**, які дадаў, што з улікам хуткасці ўзвядзення жылля ў Смалявіцкім раёне для тых, хто мае ў ім патрэбу (сацыяльнае жыллё атрымаў 41 чалавек за два гады), чарга да яго дойдзе ў лепшым выпадку гады праз чатыры.

— Пераскочыць чаргу ніхто не мае права. Я не магу вам без чаргі выдзеліць жыллё, — заўважыла Наталля Качанава і прапанавала яму паспрабаваць варыянт арэнднага жылля па чарзе. — Сацыяльнае і арэнднае жыллё сёння не прыватызуецца і не прадаецца, таму раю вам паспрабаваць арэнднае жыллё. Яго вы можаце атрымаць ужо зараз, а сацыяльнае — праз чатыры гады.

Тут жа падлічылі, што мужчыну гэта абыдзецца ў 120—150 рублёў у месяц плюс налічэнні за камунальныя паслугі (50 %, бо ён інвалід). Са сваёй пенсіі ў 700 рублёў мужчына гэта пацягне, заўважыў ён і адразу пагадзіўся на прапанову сенатара, якая паабяцала, што будзе трымаць на кантролі пытанне атрымання мужчынам жылля.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# Што тармозіць будаўніцтва стадыёна ў Мастах

## Гродзенскія дэпутаты разгледзелі ход рэалізацыі праграмы «Фізкультура і спорт»

**Пытанні развіцця рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы па развіцці фізічнай культуры і спорту на 2021—2025 гады сталі тэмай чарговага пасяджэння прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, якое адбылося ў горадзе Масты. Дэпутаты наведалі шэраг аб'ектаў, у тым ліку праблемных.**

Падчас адкрыцця пасяджэння старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта акрэсліла важнасць заняткаў масавай фізічнай культурай і спортам. На яе думку, работнікі гэтай сферы павінны больш актыўна прыцягваць людзей да мерапрыемстваў такога роду, а таксама рыхтаваць спартсменаў для высокіх дасягненняў. Тым больш што гэтаму кірунку ўдзяляецца вялікая ўвага з боку кіраўніцтва дзяржавы і органаў дзяржаўнай улады. Ствараецца адпаведная спартыўная інфраструктура.

У гэтым дэпутаты змаглі ўпэўніцца пры наведванні шэрагу дзеючых аб'ектаў раённага цэнтра. Такім чынам, адбылося знаёмства з работай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Прынеманскі», фізкультурна-спартыўнага клуба. Кіраўнікі спартыўных аб'ектаў расказалі аб дасягненнях сваіх выхаванцаў, перамогах, атрыманых імі на рознага роду спаборніцтвах.

А вось рэканструкцыя гарадскога стадыёна зацягнулася. Прычына — недахоп кадраў. У сувязі з гэтым ход будаўнічых работ адстае ад графіка. Пры гэтым і фінансаванне, і жаданне давесці аб'ект да лагічнага завяршэння прысутнічаюць. А вось з будаўнікамі пакуль замінка. Між тым гэта пытанне будзе вырашацца, запэўнілі ў адміністрацыі раёна. Праблемным застаецца пытанне набыцця новага інвентару ў трэнажорную залу. Умовы правядзення тэндара не заўсёды дазваляюць набыць якаснае абсталяванне для заняткаў цяжкай атлетыкай. Гэта стрымлівае развіццё тэхнічнай базы трэнажоркі.

Між тым дэпутаты, што называецца, свежым вокам ацанілі мясцовы ФАК. Да шэрагу існуючых працэдур яны параілі дадаць заняткі па фітнесу, трэнажоры для жанчын, дадатковыя аздараўленчыя працэдуры, напрыклад, кіслародныя кактэйлі, а магчыма, і лячэбныя ванны.

Як паведаміў у сваёй справаздачы перад дэпутатамі начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Максім Малахоўскі, дзяржаўная праграма ў частцы фізічнай культуры і спорту ў рэгіёне ў цэлым выконваецца. За год спартыўную падрыхтоўку прайшлі больш за 18 тысяч чалавек. За апошнія пяць гадоў пабудавана значная колькасць аб'ектаў спартыўнай інфраструктуры, праведзена звыш 1,5 тысячы спартыўных святаў і спаборніцтваў. Разам з тым былі вызначаны і недахопы. У прыватнасці, зроблены акцэнт на недасканалую падрыхтоўку спартсменаў, іх колькасць, выкананне спартыўных разрадаў.



Фота mosty-zara.by

Што датычыцца масавага спорту, дэпутаты зацікавіліся вопытам работы Гудзевіцкага сельскага Савета. Старшыня сельвыканкама Вікторыя Палойка расказала аб мясцовым вопыце прыцягвання насельніцтва ў масавыя заняткі фізічнай культурай, у аснове якіх ляжаць сямейныя спаборніцтвы і актыўны адпачынак.

На думку старшыні аблсавета Алены Пасюты, добрым штуршком для развіцця гэтага кірунку дзейнасці мясцовых органаў улады можа стаць прыклад кіраўнікоў рознага ўзроўню, якія не павінны заставацца ўбаку ад правядзення спартыўных мерапрыемстваў. У гэтым сэнсе паказальнай можа стаць пазіцыя кіраўніка Гродзенскай вобласці Уладзіміра Караніка і памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Юрыя Караева, якія не толькі з'яўляюцца актыўнымі балельшчыкамі, але і заўзятымі спартсменамі. Вакол іх стварылася каманда, якая прымае ўдзел у спаборніцтвах па футболе і валейболе.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**